Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

*Пераможца V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыі «Найлепшая шматтыражная газета»*

7 снежня 2012 года, № 20 (2079)

АФІЦЫЙНА

## Партнёрства ў міжнароднай дзейнасці

**28 лістапада ў Міністэрстве замежных спраў Беларусі падпісана партнёрская дамова па ўдасканаленні падрыхтоўкі кадраў у сферы міжнароднай дзейнасці.**



Фота БелТА

Дакумент падпісалі міністр замежных спраў Рэспублікі Беларусь Уладзімір Макей, міністр адукацыі Рэспублікі Беларусь Сяргей Маскевіч, рэктар БДУ Сяргей Абламейка, рэктар БДЭУ Уладзімір Шымаў і рэктар МДЛУ Наталля Баранава.

Мэтай пагаднення з'яўляецца супрацоўніцтва Міністэрства замежных спраў, Міністэрства адукацыі і вышэйшых навучальных устаноў у справе ўдасканалення падрыхтоўкі кадраў па спецыяльнасцях у сферы міжнароднай дзейнасці, якія б валодалі глыбокімі прафесійнымі ведамі, высокай агульнай культурай і цвёрдымі патрыятычнымі перакананнямі, былі б здольныя да дзяржаўнага мыслення, да ўсведамлення нацыянальных інтарэсаў.

У прыватнасці, у рамках рэалізацыі пагаднення прадугледжана ўзмацненне ўзаемадзеяння міністэрстваў і ВНУ па ўдасканаленні навучальных праграм і планаў, стварэнне дзейснай сістэмы прафесійнага адбору студэнтаў для далейшай працы ў сферы міжнароднай дзейнасці, спрыянне навучальным установам ў пашырэнні міжнародных кантактаў і пошуку новых магчымасцяў арганізацыі стажыроўкі студэнтаў. Адным з важных напрамкаў узаемадзеяння стане таксама правядзенне фундаментальных і прыкладных навуковых даследаванняў у галіне міжнароднай праблематыкі.

Пагадненне падпісана тэрмінам на пяць гадоў з магчымасцю пралангацыі. Дэталізацыя палажэнняў дакумента знойдзе адлюстраванне ў штогадовых працоўных праграмах сумеснага ўзаемадзеяння МЗС і вышэйшых навучальных устаноў.

**Паводле інфармацыі БелТА**

### Чытайце ў нумары:

**ФІЛІЯЛ БДУ Ў … НЯСВІЖЫ?**
Пра чарговае выязное пасяджэнне рэктарата, гэтым разам у гістарычнай рэзідэнцыі буйных магнацкіх родаў Беларусі
Стар. 2

**ПРАДУГЛЕДЗЕЦЬ НА БУДУЧЫНЮ**
Міністр унутраных спраў РБ Ігар Шуневіч распавёў у БДУ пра дзейнасць свайго ведамства
Стар. 3

**БДУ Ў ТВАІМ ФАРМАЦЕ**
Падведзены вынікі конкурсу відэаролікаў і фатаграфій, створаных студэнтамі на тэму «БДУ ў тваім фармаце»
Стар. 4

### Весткі з рэктарата

РЭКТАР БДУ акадэмік Сяргей Абламейка прыняў удзел у працы сімпозіума ААН па выкарыстанні касмічных тэхналогій для эфектыўнага сацыяльна-эканамічнага развіцця, які праходзіў з 12 па 16 лістапада ў г. Сант'яга (Рэспубліка Чылі).

Акрамя таго, Сяргей Абламейка ўдзельнічаў у мерапрыемствах, прысвечаных 170-годдзю з дня заснавання чылійскага ўніверсітэта, наведаў музей яго рэктара ў 1867–1883 гг. беларуса па паходжанні Ігната Дамейкі, прызнанага нацыянальным героем Чылі.

Таксама Сяргей Абламейка абмеркаваў перспектывы супрацоўніцтва з рэктарам дадзенага ўніверсітэта прафесарам Віктарам Перэсам Верай.

* * *

ПРАФЕСАРЫ Лодзінскага тэхнічнага ўніверсітэта (Польшча) Дэвід Стаўскі, Будапешцкага ўніверсітэта тэхналогіі і эканомікі (Венгрыя) Пітэр Мізсей, а таксама Інстытута хімічнай тэхналогіі (Чэхія) Павел Драшар выступілі па лініі Міжнароднага Вышаградскага фонду з лекцыямі перад студэнтамі хімічнага факультэта БДУ.

* * *

ДВАНАЦЦАЦЬ новых філіялаў кафедраў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта зацверджаны 26 лістапада на пасяджэнні Савета БДУ.

Дзейнасць філіялаў кафедраў БДУ, а іх цяпер налічваецца 48, накіравана на павышэнне якасці прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў у рамках вучэбна-метадычнай, арганізацыйнай і навукова-даследчай працы.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

ВЕДАЙ НАШЫХ!

## Змадэлявалі СГА

**Зборная факультэта міжнародных адносін БДУ атрымала перамогу ў агульнакамандным заліку на першым міжнародным конкурсе «Мадэль СГА» (Сусветнай гандлёвай арганізацыі).**

У асабістым заліку студэнткі 5 курса ФМА Аляксандра Бялегава і Анастасія Бацечка таксама выйшлі пераможніцамі, заняўшы першае і другое месца.

Гэты конкурс быў арганізаваны Усерасійскай акадэміяй знешняга гандлю Міністэрства эканамічнага развіцця РФ і ўяўляе сабой гульнявую імітацыю вырашэння міждзяржаўных спрэчак па праве СГА.

На папярэднім завочным этапе, які пачаўся 5 лістапада, у барацьбу ўключыліся 29 каманд з Расіі, Казахстана і Беларусі. І ўжо тут зборная ФМА БДУ, у якую ўваходзілі таксама пяцікурсніца Марыя Макас і студэнтка 3 курса Ганна Кудравец, апярэдзіла апанентаў і атрымала 46 балаў з 50 магчымых. Далейшую барацьбу дзяўчаты працягнулі ўжо ў Маскве 26–28 лістапада разам з 16 найлепшымі камандамі. У выніку каманда ФМА БДУ з 168,52 баламі здолела апярэдзіць сваіх прынцыповых апанентаў з МДІМА, у якіх 165,29 балаў. Затым з вялікім адставаннем ранжыраваліся Казанскі (Прыволжскі) федэральны ўніверсітэт (132,2), СПбДУ – 122,71. Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт, да прыкладу, толькі на дзявятым месцы з 90,57 баламі.

Пераможцам уручаны граматы і каштоўныя прызы.

Паспяховае выступленне каманды ФМА стала магчымым дзякуючы самаадданай працы ўсіх яе ўдзельнікаў пад кіраўніцтвам старшага выкладчыка кафедры міжнароднага прыватнага і еўрапейскага права ФМА Аляксея Аніщанкі. Неацэнную дапамогу ў падрыхтоўцы аказалі выпускнікі гэтага факультэта мінулых гадоў – Алена Кумашова, Марыя Ягорава, Алеся Цыбус і Андрэй Мачалаў, а таксама выкладчык юрфака БДУ Тамара Сакольчык, а арганізацыйнае і метадычнае садзейнічанне – міжнародная юрыдычная фірма SORAINEN.

**Дар'я ЧАРНЯЎСКАЯ**

## Чэмпіёнская хада

**Студэнты біялагічнага факультэта БДУ занялі абсалютнае першае месца на II Міжнароднай біялагічнай універсіядзе.**

У складзе каманды пяцікурсніцы Кацярына Кастагладава і Аксана Кірсанава, чацвёртакурснікі Антон Кавалеўскі і Арцём Маргуноў і трэцякурснік Андрэй Сухарэўскі. Падрыхтоўкай кіраваў дацэнт кафедры генетыкі біяфака Васіль Грынёў.

Універсіяда праходзіла 23 і 24 лістапада ў Маскоўскім дзяржаўным універсітэце імя М. В. Ламаносава па ініцыятыве яго рэктара акадэміка Віктара Садоўнічага. У спаборніцтвах прынялі ўдзел 17 каманд з Расіі, Украіны і Беларусі.

Дарэчы, нашы студэнты выступалі ў гэтых спаборніцтвах упершыню і адразу ж паказалі сваю перавагу. Сярод іх ёсць пераможцы міжнародных алімпіяд па біялогіі розных гадоў.

**Таццяна МАЛЯРОВА**




*А. Кавалеўскі, А. Кірсанава, К. Кастагладава, А. Сухарэўскі, А. Маргуноў*

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

# ФІЛІЯЛ БДУ Ў… НЯСВІЖЫ?

**У апошні час кіраўніцтва нашага ўніверсітэта стала рэгулярна праводзіць выязныя пашыраныя пасяджэнні рэктарата, прычым геаграфія іх шырокая: ад сумесных адукацыйных калегій у Туле і Гродне да вытворчай нарады ў Салігорску на ПА «Беларуськалій». Гэтам разам пераважала культуралагічная місія ў Нясвіжы, у гістарычнай рэзідэнцыі буйных магнацкіх родаў Беларусі.**



Фота Аляксандра СНАПКА

У чарговым выязным пасяджэнні прынялі ўдзел дэканы факультэтаў і начальнікі ўпраўленняў БДУ, якія разам з дырэкцыяй знакамітага палацава-замкавага комплексу абмеркавалі прэзентацыю сучасных магчымасцяў вядучай навучальнай установы нашай краіны.

З цікавым дакладам «Гісторыя стварэння ўніверсітэтаў ва Усходняй Еўропе: ад мінулага да сучаснасці» выступіў рэктар акадэмік Сяргей Абламейка. У 30-я гады XX стагоддзя князь Альбрэхт Радзівіл аддаў правае крыло замка пад настаўніцкую семінарыю. І цалкам магчыма, што невыпадкова пасяджэнне супрацоўнікаў вядучай ВНУ краіны праходзіла менавіта ў гэтых апартаментах. Хочацца падкрэсліць, адмысловы шарм і дзівосную атмасферу мерапрыемству надаваў антураж адрэстаўраваных у 2010 годзе залаў: інкруставаны пазалотай дзвярныя ручкі і ўпрыгожаныя мудрагелістай ляпнінай столі, мармуровыя калоны і партрэты прадстаўнікоў дынасціі Радзівілаў у стылі ракако, срэбныя і парцалянавыя прадметы побыту, гарнітуры і асабістыя рэчы магнатаў... Як вядома, асабліва каштоўныя прадметы культурнай спадчыны ў Беларусі стаяць асобным радком. У гэты «VIP-рэестр» трапляюць перш за ўсё тыя помнікі культуры і гісторыі, якія ўваходзяць у спіс Сусветнай спадчыны. Штогод ён папаўняецца новымі аб'ектамі.

Нясвіжскі замак у спіс ЮНЕСКА ўнеслі ў 2005 годзе. Палацава-замкавы комплекс у Нясвіжы – адзін з найцікавейшых помнікаў архітэктуры Беларусі – узводзіў італьянскі архітэктар Джавані Марыя Бернардоні. А ініцыятыва стварэння каменнага замка належыць першаму нясвіжскаму ардынату Мікалаю Хрыстафору Радзівілу Сіротку. Пачатак будаўніцтва адносіцца да 1583 года. Бальная, камінная, малая сталовая залы... У белай бальнай зале з радзівілаўскіх часоў добра захаваліся панэлі, калоны, ляпніна па перыметры столі і над люстрамі, дапаўняе інтэр'ер салонны гарнітур XIX стагоддзя, адмыслова набыты для гэтага памяшкання. Дарэчы, як высветлілася падчас экскурсіі, большасць экспанатаў з вялікімі цяжкасцямі былі выкуплены і зусім нядаўна прывезены ў Беларусь з прыватных калекцый і музеяў з сусветнымі імёнамі. Паколькі сучасныя законы еўрапейскіх краін не дазваляюць вывозіць гістарычныя каштоўнасці з краіны нават пры наяўнасці суправаджальных дакументаў, шматлікія спрадвечна нашыя музейныя рарытэты сёння «стаяць» у чарзе, каб вярнуцца на сваю гістарычную радзіму. Зрэшты, як распавёў дырэктар Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Нясвіж» Сяргей Клімаў, як высветлілася, выпускнік гістфака БДУ, у першыя дзевяць месяцаў 2012 года замак наведалі аж 290 тысяч чалавек, а чакалася, што за год у цэлым ён прыме 300 тысяч экскурсантаў. Пры гэтым максімальная прапускная здольнасць замка – 500 тысяч. Калі перавысіць гэту планку, паўстане небяспека для захаванасці экспанатаў... Як вы разумееце, музей-замак пры ўсім тым, што мае сёння – вельмі і вельмі прывабны для навукоўцаў і турыстаў. Удзельнікі пасяджэння пашыранага рэктарата і навуковыя супрацоўнікі музея-запаведніка аднадушна прыйшлі да меркавання, што студэнты Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта могуць і павінны выконваць тут розныя даследчыя і практычныя працы. І што ў найбліжэйшай будучыні цалкам лагічна і апраўдана будзе стварэнне на базе Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Нясвіж» філіяла кафедры гістарычнага факультэта... І актуальнасць паднятага пытання пацвердзіў выступ маладога выкладчыка гістфака БДУ Аліны Верамейчык – ураджэнкі Нясвіжа. У камінной зале яна таксама прачытала лекцыю-прэзентацыю, якая адпавядала агульнай тэме і антуражу: пра гістарычную спадчыну Радзівілаў і іх уплыў на развіццё адукацыі. Больш падрабязна пра перспектывы супрацоўніцтва нашага ўніверсітэта з музеем-запаведнікам мы распавядзём у наступных нумарах.

**Жанна ВАСАНСКАЯ**

ВЫСТАВЫ

# Індыйскі міжнародны кірмаш

**Два пагадненні аб супрацоўніцтве ў адукацыйнай і навуковай сферах і тры пратаколы аб намерах падпісаны Белдзяржуніверсітэтам падчас працы 32-га Індыйскага міжнароднага гандлёвага кірмашу, якая праходзіў у Нью-Дэлі з 14 па 27 лістапада. Дэлегацыю БДУ ўзначальваў прарэктар па эканоміцы і інвестыцыях Уладзімір Панарадаў.**



Першае пагадненне тычыцца супрацоўніцтва БДУ і *Універсітэта імя Джавахарлала Неру*. У ім вызначаны канкрэтныя задачы гуманітарнага плана: вывучэнне санскрыту і рускай мовы, даследаванне літаратуры і культуры дзвюх краін, вывучэнне сучасных грамадскіх дысцыплін з акцэнтам на даследаванне розных сацыяльных сфер Індыі.

Другое пагадненне замацоўвае партнёрства паміж БДУ і *Абаронным інстытутам перадавых даследаванняў (АІПД)* г. Пуна ў правядзенні сумесных навуковых пошукаў у галіне нанаэлектрамагнетызму. Плануецца стварэнне сумеснай лабараторыі на базе БДУ, падрыхтоўка аспірантаў, магістрантаў і суіскальнікаў дзвюх краін. У АІПД перад выкладчыкамі і аспірантамі выступіў з лекцыяй загадчык лабараторыі электрадынамікі неаднародных асяроддзяў НДІ ядзерных праблем БДУ прафесар Сяргей Максіменка. Ён распавёў пра напрамкі даследаванняў у галіне нанаэлектрамагнетызму, стварэнне электрамагнітных пакрыццяў і праводных керамік, што выконваюцца сумесна навукоўцамі НДІ ядзерных праблем і фізіка-хімічных праблем БДУ.

На міжнародным кірмашы ў нацыянальнай экспазіцыі Рэспублікі Беларусь было прадстаўлена болей за 40 навукова-тэхнічных распрацовак навукоўцаў БДУ. Асаблівую зацікаўленасць выклікалі тэхналогія ачысткі вады на аснове выкарыстання новых плёначна-тканкавых матэрыялаў і вугальнага сарбенту; сінтэтычныя алмазы; тэхналогія атрымання паліўных гранул з біямасы; комплексы абсталявання для вытворчасці вырабаў з пенаполіўрэтанаў і камп'ютарна-арыентаваныя прыборы.

У дзень адкрыцця выставачны стэнд БДУ наведалі Прэм'ер-міністр Беларусі М. У. Мясніковіч і міністр гандлю Рэспублікі Індыя Ананд Шарма (на здымку).

За час знаходжання ў Індыі дэлегацыя БДУ прыняла ўдзел у працы беларуска-індыйскага бізнес-форуму, 8-га пасяджэння савета дзелавога супрацоўніцтва «Беларусь–Індыя» і кантактна-каапераціўнай біржы. З некалькімі індыйскімі кампаніямі былі падпісаны пратаколы аб намерах.

**Паводле інфармацыі ГУН**

НАВАЦЫІ

# Адукацыю абмеркавалі online

**Першая міжнародная інтэрнэт-канферэнцыя «Інфармацыйна-тэхналагічнае забеспячэнне адукацыйнага працэсу дзяржаў-удзельніц СНД» завяршылася ў БДУ.**

Арганізавалі яе Міністэрства адукацыі нашай краіны і БДУ. Вынікі падвялі 30 лістапада.

На канферэнцыю было даслана і размешчана на адпаведным сайце 62 даклады навукоўцаў з Беларусі, Расіі, Украіны, Казахстана і Аўстраліі. У дыскусіях удзельнічалі каля 150 чалавек. На форумах актыўна абмяркоўваліся пытанні, якія тычацца распрацоўкі новых метадалогій, канцэпцый і мадэляў арганізацыі навучання, выкарыстання ў адукацыйных практыках сучасных сістэм кіравання. Удзельнікі падзяліліся ўласным бачаннем інфармацыйнай палітыкі ВНУ.

На думку арганізатараў, дадзенае мерапрыемства прадэманстравала перавагі правядзення навуковых канферэнцый у сусветнай павуціне. Гэта новыя магчымасці больш эфектыўнага міжнароднага супрацоўніцтва ў сферы адукацыі і навукі; забеспячэння сусветных стандартаў падрыхтоўкі спецыялістаў; аператыўнага абмену навукова-тэхнічнай інфармацыяй, а таксама развіццё агульнай навукова-адукацыйнай прасторы.

Разам з тым выяўлены праблемныя палі ў рэалізацыі праграм інфарматызацыі ўніверсітэцкай адукацыі: адсутнасць узгодненасці ў інфармацыйна-адукацыйнай палітыцы ВНУ краін СНД, разнароднасць праграмнага забеспячэння і тэхнічных рэсурсаў; недастатковая ўвага дзейных праграм інфарматызацыі да магчымасцяў адукацыйнай платформы Moodle, якая шырока выкарыстоўваецца большасцю заходніх універсітэтаў, і інш.

Мяркуецца, што інтэрнэт-канферэнцыя стане штогадовым навуковым мерапрыемствам, скіраваным на маніторынг, аналіз і ўдасканаленне інфармацыйна-тэхналагічнага забеспячэння вышэйшай адукацыі, што дазволіць у далейшым праводзіць такія форумы па розных актуальных тэматыках, эканомячы пры гэтым велізарныя сродкі.

Па выніках канферэнцыі ўсе даклады будуць апублікаваныя ў электронным выданні з прысваеннем індэкса ISBN. Зборнік размешчаны ў адкрытым доступе ў электроннай бібліятэцы БДУ *www.elib.bsu.by*. Кожнаму дакладу прысвойваецца свой URL для спасылак.

Падрабязная інфармацыя пра канферэнцыю і яе вынікі размешчана ў відэаблогу рэктара БДУ акадэміка Сяргея Абламейкі (*www.bsu.by/main.aspx?guid=437883*).

**Юрый ПАЗНЯК,**
**начальнік аддзела ГУВНМР**

ВІЗІТЫ

# Прадугледзець на будучыню

**Міністр унутраных спраў РБ Ігар ШУНЕВІЧ выступіў 27 лістапада ў БДУ і распавёў супрацоўнікам і навучэнцам пра дзейнасць падкантрольнага яму ведамства.**



Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА

У асноўным гаворка ішла пра дзейнасць антытэрарыстычных сіл Беларусі – з гэтай нагоды ў пачатку сустрэчы быў паказаны дакументальны фільм «На грані «Алмаза», які распавядае пра вядомае элітнае падраздзяленне МУС – склад баявых груп, узбраенне, выбітныя аперацыі.

«Тэрарызм набыў сёння такія формы, якія, можна і трэба прызнаць, дзяржавы пакуль не могуць цалкам нівеляваць», – прызнаўся Ігар Анатольевіч. Найбольш небяспечны экстрэмізм, які ў большасці выпадкаў з'яўляецца асноўнай тэрарызму. Распавядаючы пра прычыны гэтых з'яў і іх мэты, міністр звярнуў асаблівую ўвагу на ролю «чацвёртай улады». Паводле яго слоў, «ласыя на тэрарыстычныя сенсацыі СМІ» лёгка становяцца асноўным інструментам тэрарыстаў у дасягненні пастаўленых мэтаў – запалохвання людзей і ўплыву на грамадскую думку.

Праблема выхавання моладзі – адна з ускосных прычын росту экстрэмісцкіх настрояў, на якія, на думку міністра МУС, грамадскасці варта звярнуць увагу. З'яўленне такіх нефармальных рухаў, як скінхэды, анархісты, футбольныя фанаты – вынік таго, што маладыя людзі сёння маюць шмат вольнага часу і не абцяжараныя клопатамі жыцця. Пагаршае сітуацыю мабільная і інтэрнэт-залежнасць, лічыць Ігар Анатольевіч.

Тэме інтэрнэт-прасторы была нададзена асаблівая ўвага. Маніторынг інтэрнэт-рэсурсаў, пошук інфармацыі пра заклікі да масавых беспарадкаў – галоўныя задачы, якія ставяцца сёння перад сілавымі структурамі ў дачыненні да сецівa: «Для барацьбы з кіберзлачыннасцю і кібертэрарызмам, які выкарыстоўвае камп'ютар у сеціве, у нас створана і функцыянуе падраздзяленне ў структуры крымінальнай міліцыі МУС».

Як «сурагатны прадукт» разгледжаный сацыяльнай з'явы міністр згадаў феномен тэлефоннага тэрарызму: «Толькі сёлета было зарэгістравана 33 заведама лжывыя паведамленні аб закладзеных выбуховых прыладах на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь», – адзначыў Ігар Анатольевіч. Практычна ўсе гэтыя справы раскрыты, але на такія выпадкі марна выдаткоўваюцца вельмі вялікія сродкі, шмат часу, гэта дэстабілізуе дзейнасць установ. Таму ўведзена крымінальная адказнасць за такога роду дзеянні.

«Сёння ўвесь свет разумее, што мірыцца з забойствамі мірных грамадзян нельга, і з тэрарыстамі трэба абыходзіцца адэкватна», – у той жа час міністр прызнаўся, што ў сітуацыях, калі тэрарызм сябе ўжо выявіў, змагацца з наступствамі – самае простае ў дзейнасці спецслужбаў. Значна складаней апярэдзіць з'яўленне тэрарыста альбо прадухіліць прычыненне ім шкоды. «Каб тэракты не паўтараліся, палітыка дзяржавы павінна быць мудрай і ўзважанай, прадугледжваць наступствы на будучыню», – сказаў Ігар Анатольевіч напрыканцы.

Пасля выступу міністр адказаў на пытанні прысутных. У прыватнасці, падзяліўся інфармацыяй, што да стагоддзя беларускай міліцыі плануецца стварыць некалькіх мастацкіх фільмаў і кніг. Магістр, запэўніў Ігар Анатольевіч, назапасіўся багаты.

**Ілья ТРАФІМАЎ**

АСОБЫ

# БЕЛАРУСКІЯ КРАЯВІДЫ ПРАЗ ЖЫЦЦЁ

**На геаграфічным факультэце Мікалай ЧАРТКО працуе 50 гадоў. Ён прайшоў шлях ад малодшага навуковага супрацоўніка НДЛ біягеахіміі глебаў да прафесара кафедры глебазнаўства і ЗІС.**



*Прафесар М. Чартко са сваімі вучнямі кандыдатамі геаграфічных навук А. Карпічэнкам (злева) і П. Жумарам (справа)*

Мікалай Канстанцінавіч надрукаваў 295 навуковых артыкулаў, распрацаваў 11 навучальных курсаў, сярод якіх геахімія ландшафтаў, матэматычныя метады ў геаграфіі, фізіка глебаў і іншыя.

Студэнты геафака ведаюць, што Мікалай Чартко вельмі патрабавальны экзаменатар, а таму сур'ёзна адносяцца да яго заняткаў. Свае лекцыі Мікалай Канстанцінавіч, як сапраўдны даследчык роднага краю, чытае па-беларуску. Менавіта беларускія ландшафты былі нанесены ім на карту.

Першая карта «Геахімічныя ландшафты», падрыхтаваная Мікалаем Чартко для Нацыянальнага атласа Рэспублікі Беларусь 2002 г., для мяне стала падарункам. Бачна, што ёй папярэднічала вялікая праца. Карта стракацьць: пробы браліся адусюль, з сельскагаспадарчых зямель, у агародах, каля лесу, у поймах лугоў, на балоцістых мясцінах... Нават цяжка ўсвядоміць, што такое магчыма. Мікалай Канстанцінавіч пацвярджае: гэта справа не аднаго дня і нават не аднаго года. Каб вывучыць кругаварот макра- і мікраэлементаў у прыродных і агроландшафтах, ён разам са студэнтамі старэйшых курсаў ездзіў па Беларусі пачынаючы з 60-х гадоў. Прывезеныя глеба, вада і расліны даследаваліся ў лабараторыі біягеахіміі глебаў пры кафедры глебазнаўства на ўтрыманне фізіялагічна значных мікраэлементаў, параўноўваўся іх хімічны склад. Затым даваліся рэкамендацыі па выкарыстанні гэтых прыродных рэсурсаў. Навуковыя абагульненні па аптымізацыі глебаў таксама далі свой плён. Прафесар ганарыцца двума аўтарскімі пасведчаннямі. Адно з іх тычыцца спосабу меліярацыі дзярнова-падзолістых паўгідраморфных глебаў, другое – спосабаў меліярацыі тарфяных глебаў нізіннага тыпу.

Доктар геаграфічных навук Мікалай Чартко справядліва лічыцца першаадкрывальнікам новага навуковага кірунку ў нашай краіне – геахіміі агроландшафтаў. Дзякуючы гэтаму яму ўдалося распрацаваць класіфікацыю і структуру, спосабы ацэнкі і аптымізацыі ландшафтаў, а таксама нейтралізацыі таксічных элементаў і злучэнняў.

Мікалай Канстанцінавіч узгадвае, што ў студэнцкія гады яго спачатку цікавілі праблемы фізічнай геаграфіі. Аднак пасля лекцый маскоўскага прафесара Перэльмана ён заняўся ў асноўным геахіміяй ландшафтаў. Цяпер ён лічыць другі курс самым прыдатным для ўзнікнення навуковых інтарэсаў. Так павялося, што студэнт, якога заўважыў Мікалай Канстанцінавіч, абавязкова з цягам часу станавіўся кандыдатам або доктарам навук. Сярод яго вучняў – кандыдаты геаграфічных навук Аляксандр Карпічэнка і Павел Жумар, а таксама Лідзія Глазкова, Ганна Таранчук, Таццяна Мышлен. Доктарскую абараніў Яраслаў Кулікоў. За паспяховае кіраўніцтва даследаваннямі студэнтаў М. К. Чартко ўзнагароджаны Ганаровай граматай Міністэрства адукацыі РБ (2001). У 2011 г. яму прысвоена званне «Заслужаны работнік БДУ».

**Ганна ЛАГУН**

АБ'ЯВЫ

**БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ**

**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:**

ЗАГАДЧЫКА КАФЕДРЫ агульнай матэматыкі і інфарматыкі,

ПРАФЕСАРАЎ КАФЕДРАЎ: геадэзіі і картаграфіі, нелінейнага аналізу і аналітычнай эканомікі, матэматычнай кібернетыкі,

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: грамадзянскага права, англійскага мовазнаўства, гісторыі беларускай мовы, гісторыі беларускай літаратуры, арганічнай хіміі, геадэзіі і картаграфіі, агульнага землязнаўства і гідраметэаралогіі, дынамічнай геалогіі, замежнай журналістыкі і літаратуры, стылістыкі і літаратурнага рэдагавання, агульнай матэматыкі і інфарматыкі, функцыянальнага аналізу, матэматычнай кібернетыкі,

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: канстытуцыйнага права, археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін, англійскага мовазнаўства, неарганічнай хіміі, стылістыкі і літаратурного рэдагавання,

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: крымінальнага працэсу і пракурорскага нагляду, гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў, нямецкага мовазнаўства.

*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Адрас: 220030, г. Мінск, вул.Бабруйская, 5 а, упраўленне кадраў, тэл. 209-54-36.*

**НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЯ ЎСТАНОВА «ІНСТЫТУТ ПРЫКЛАДНЫХ ФІЗІЧНЫХ ПРАБЛЕМ ІМЯ А. Н. СЕЎЧАНКІ» БДУ**

**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС**

**НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАДЫ**

СТАРШАГА НАВУКОВАГА СУПРАЦОЎНІКА па спецыяльнасці 01.04.01 (прылады і метады эксперыментальнай фізікі).

*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Адрас: г. Мінск, вул. Курчатава, 7*

*Тэлефон 212-48-43.*

**ІНСТЫТУТ ТЭАЛОГІІ ІМЯ СВЯТЫХ МЯФОДЗІЯ І КІРЫЛЫ БДУ**

**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ВАКАНТНЫХ ПАСАД**

ДАЦЭНТА КАФЕДРЫ рэлігіязнаўства (0,75 стаўкі па спецыяльнасці параўнальнае рэлігіязнаўства)

ДАЦЭНТА КАФЕДРЫ біблеістыкі і хрысціянскага вераВучэння (0,5 стаўкі па спецыяльнасці Новазапаветная біблеістыка).

*Тэрмін конкурсу – месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Адрас: 220030, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 24, тэл. 220-23-55.*

## НАШЫ ЮБІЛЯРЫ

**2 снежня Саўко Эмілія Іосіфаўна,** дацэнт кафедры фізвыхавання і спорту

**6 снежня Песнякевіч Аляксандр Георгіевіч,** дацэнт кафедры мікрабіялогіі

**8 снежня Сакольскі Анатоль Аляксеевіч,** дацэнт кафедры фізічнай інфарматыкі і атамна-малекулярнай фізікі

**22 снежня Янчук Алена Ігнацьеўна,** дацэнт кафедры філасофіі і метадалогіі навукі

**27 снежня Далгарукаў Сяргей Валер'евіч,** дацэнт кафедры крымінальнага працэсу і пракурорскага нагляду

**28 снежня Карасёва Святлана Генадзьеўна,** дацэнт кафедры філасофіі культуры

**29 снежня Пратасавіцкі Сяргей Пятровіч,** дацэнт кафедры грамадзянскага права

*Спіс усіх імянніннікаў размешчаны на сайце БДУ www.bsu.by ў раздзеле «Нашы юбіляры».*

**Паводле інфармацыі ўпраўлення кадраў БДУ**

## БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

**Міжнародная навуковая канферэнцыя ў гонар 90-годдзя з дня нараджэння доктара філалагічных навук прафесара Ефрасінні Бондаравай** – «Звязда», 21.by (30.11).

**Навуковыя праекты БДУ, якія будуць рэалізаваны па лініі беларуска-в'етнамскага інавацыйна-адукацыйнага цэнтра** – БелТА, 21.by (29.11).

**Заняткі ў рэжыме online старшага выкладчыка кафедры эканамічнай інфарматыкі і матэматычнай эканоміі эканамічнага факультэта БДУ Паўла Кожыча** – «Рэспубліка», respublika.info, tut.by (29.11).

**Круглы стол па праблемах бесперапыннай адукацыі на механіка-матэматычным факультэце БДУ** – «Настаўніцкая газета» (29.11).

**Шырмаўскія чытанні на філалагічным факультэце БДУ** – БелТА, 21.by (28.11), «Минск-новости» (29.11).

**Пра методыкі Рэспубліканскага цэнтра праблем чалавека БДУ па выяўленні таленавітых дзяцей** – «Народная газета», ng.by, 21.by (27.11).

**Міжнародная навуковая канферэнцыя «Вайна 1812 года і Беларусь»** – «Минск-новости» (22.11), istpravda.ru (24.11), regnum.ru. (23-24.11, 27.11).

**Перамога ліцэістаў БДУ на алімпіядзе Саюзнай дзяржавы «Россия и Беларусь: историческая и духовная общность»** – «СБ–Беларусь сегодня» (22.11).

**Круглы стол па праблемах адукацыі праграмістаў і іх далейшага лёсу** – sb.by, «СБ–Беларусь сегодня» (22.11), «Народная газета» («Союзное вече», 08-14.11).

**Перамога каманды ліцэя БДУ на Рэспубліканскім турніры юных матэматыкаў** – БелТА (15.11), «Минск-новости» (16.11), «Настаўніцкая газета» (17.11).

**Гутарка з першым прарэктарам БДУ Міхаілам Жураўковым пра стварэнне ў БДУ цэнтра навук пра Зямлю** – «Белорусская нива», 21.by (14.11).

**Конкурс сярод студэнтаў на найлепшую ідэю наназпадарожніка** – БелТА (01.11), 21.by, tut.by (13.11).

**Экспарт адукацыйных паслуг БДУ** – «Настаўніцкая газета» (01.11).

**Да 20-годдзя ўпраўлення міжнародных сувязяў БДУ** – «Настаўніцкая газета» (01.11).

**Пра прафесарскі сход БДУ** – «Настаўніцкая газета» (01.11).

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

# БДУ ў тваім фармаце

**29 лістапада ў актавай зале Інстытута журналістыкі пры вялікай колькасці творчай моладзі нашага ўніверсітэта былі падведзены вынікі студэнцкага конкурсу відэаролікаў і фатаграфій «БДУ ў тваім фармаце».**

Сярод відэа спаборнічалі 16 прац, а з 200 дасланых фатаграфій у фінал выйшлі 46. Прычым конкурс відэаролікаў праводзіўся сёлета ўпершыню. Працы ацэньваліся ў трох намінацыях. І ў кожнай журы на чале з прарэктарам па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях БДУ Уладзімірам Суворавым вызначыла пераможцаў.

Так, у ***намінацыі «БДУ – гэта мы»*** больш за ўсіх балаў набраў ролік студэнткі ФПМІ *Таісіі Шабуні*, у ***намінацыі «Дух студэнцтва»*** найлепшай прызнана работа студэнта механіка-матэматычнага факультэта *Антона Сцяшко*; у ***намінацыі «Рэклама ўніверсітэцкай адукацыі»*** ўзнагароду атрымаў *Артур Пракопчык* (ФМА). Дарэчы, вызначэнне пераможцы ў апошняй намінацыі відэаролікаў выклікала найбольшую дыскусію ў журы. Праца А. Пракопчыка «Святло і цемра» была зроблена на вельмі высокім прафесійным узроўні з магутным сацыяльным падтэкстам, хоць і не зусім адпавядала зададзенай скіраванасці.

Акрамя таго, дыпломамі конкурсу ўзнагароджаны: за найлепшую жаночую і мужчынскую ролю студэнты ФФСН *Паліна Хамякова і Аляксей Касцюк*; за найлепшы сцэнар *Улад Попчанка* (Інстытут журналістыкі); за найлепшую аператарскую працу – *Антон Сцяшко* (ММФ) і за найлепшае гукавое афармленне *Павел Астравух* (Інстытут журналістыкі).




Фота Аляксандра СНАПКА

Сярод фатаграфій найлепшымі ў ***намінацыі «Асобы БДУ»*** прызнаныя працы аўтараў *Антона Шункова* (1 месца, ФПМІ); Таісіі Шабуні (2 месца) і Яўгеніі Давыдкінай (3 месца, ІБМТ).

У ***намінацыі «Мой горад»*** першае месца заслужылі *Антон Сцяшко* (ММФ), другое – Антон Мартысевіч (РФКТ) і трэцяе – Алена Судакова (юрфак). У ***намінацыі «Нечаканы ракурс»*** пераможцам прызнаны *Максім Каленік* (ФПМІ). А ў ***намінацыі «Рэпартаж»*** на першым месцы апынулася *Таісія Шабуня* (ФПМІ), на другім – Антон Шункоў (ФПМІ) і на трэцім – Андрэй Касцючук (ДІКСТ).

Як відаць, некаторыя з удзельнікаў абодвух конкурсаў (Т. Шабуня, А. Сцяшко і інш.) праявілі сябе як шматстаночнікі, прычым вельмі паспяховыя.

Як ужо згадвалася, конкурс фотапрац праводзіцца ўжо некалькі гадоў, а вось конкурс відэаролікаў прайшоў упершыню і выклікаў вялікую цікавасць. Такі фармат, відома ж, вельмі зручны для прагляду, да таго раскрывае ўвесь дыяпазон творчых здольнасцяў аўтараў. На думку загадчыка лабараторыі аўдыявізуальных тэхналогій Андрэя Віктаравіча Катрэнкі, з тэхнічнага пункта гледжання якасць відэа была практычна ва ўсіх на высокім узроўні, хоць большасць чамусьці не прытрымліваліся зададзеных параметраў: разрашэнне відэа, частата кадраў, частата дыскрэтызацыі гуку. Але на «малюначак» гэта не моцна паўплывала. Сюжэты здымаліся на рознай тэхніцы: ад аматарскай камеры ці добрай мыльніцы да прац камерцыйнага ўзроўню на прафесійнай апаратуры, вартых паказу на тэлебачанні. Гэта самае дзіўнае, бо ў нашым універсітэце, да прыкладу, камп'ютарнаму мантажу навучаюць толькі на кафедры тэлебачання і радыёвяшчання ў Інстытуце журналістыкі. Астатнія ж студэнты самавучкі, але выдаюць такі вынік! Гэта галоўнае адкрыццё.

З нецярпеннем чакаем наступнага конкурсу!

**Ірына МІРОНАВА**

У ВОЛЬНЫ ЧАС

# Сціраем межы

**Студэнцкі гарадок БДУ пры падтрымцы Міністэрства адукацыі Беларусі арганізаваў свята, якое аб'ядноўвае, згуртоўвае і знаёміць паміж сабой розныя культуры і народы. 28 лістапада прайшоў IV Міжуніверсітэцкі фестываль нацыянальных культур.**

Урачыстае мерапрыемства наведалі рэктар БДУ акадэмік Сяргей Абламейка, прарэктар па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях Уладзімір Сувораў, а таксама прадстаўнікі пасольстваў Ірана, Турцыі і Азербайджана.

Студэнты з Туркменістана, Нігерыі, Ганы, Ірана, Кітая, Кубы і іншых краін радавалі гледачоў і адзін аднаго народнымі танцамі і песнямі, сучаснымі рытмамі і папулярнымі хітамі, а таксама віртуознай ігрой на музычных інструментах. Кітаянка Ван Лін прадставіла народны танец, які адрозніваецца асаблівай грацыяй і пластыкай. А яе суайчыннік, які прыехаў з гродзенскага ўніверсітэта з танцавальнай групай падтрымкі, проста «падарваў» залу, выканаўшы папулярны зараз сярод моладзі хіт Gangnam Style. Голас, танцы, касцюмы – усё гэта выклікала буру авацый!

Не горш выступілі і прадстаўнікі сонечнага Туркменістана. Джыгіты з БДУКМ Мурат і Бегенч сваім танцам перанеслі нас на бязмежныя прасторы сваёй радзімы, акунулі ў свет свабоды і прыгод. А Ізатбек Ібрагімаў выканаў на фартэпіяна мелодыю туркменскага кампазітара. Вялікая колькасць інструментальных нумароў, несумненна, парадавала. У першую чаргу гэта студэнты з Акадэміі музыкі Чжоу Пэн і Лю Янь, якія выканалі іспанскае танга дуэтам на скрыпцы і фартэпіяна, а таксама інтэрнацыянальная група «Пульс» з песняй з рэпертуару Крысціны Агілеры. Сэрцы ўсіх на імгненне замерлі, калі на сцэне з'явіліся кітайскія дзяўчаты з эканамічнага ўніверсітэта. Іх дуэт флейты і скрыпкі быў справядліва названы «дуэтам душы і сэрца», так пяшчотна і пранікнёна гэта гучала.

Сёлета тут упершыню выступіў прадстаўнік Малайзіі. Махеш Мумуйрулан выйшаў на сцэну з дудой. Інструмент складаная канструкцыі і формы вырабляў неверагодныя, чароўныя гукі, якія нельга атрымаць ні на адным іншым інструменце. Бадай, гэта стала каштоўным папаўненнем фестывалю!

Беларусь на фестывалі была прадстаўлена заслужаным ансамблем танца «Крыжачок». Яго танцоры ў шыкоўных нацыянальных строях закруцілі на сцэне «Польку кругавую» і лішні раз даказалі, што і ў нас бывае «горача»! Фінальная кампазіцыя – беларуская песня «Васільковае неба» ў выкананні кубінкі Луселіі Ролдан – стала сапраўды гімнам фестывалю культур, які сабраў на адной сцэне артыстаў з розных краін і кантынентаў. Пажадаем міжуніверсітэцкаму фестывалю далейшага росквіту і новых адкрыццяў.

**Наталля МАЖУЛЬ**



ВІНШУЕМ!

# У фінале

**Каманда студэнтаў БДУ заваявала права ўдзелу ў фінале чэмпіянату свету па праграмаванні.**

У Санкт-Пецярбургу, Барнауле, Тбілісі і Ташкенце ў нядзелю 2 снежня адбыўся паўфінал студэнцкага каманднага чэмпіяната свету па праграмаванні ў Паўночна-Усходнім еўрапейскім рэгіёне. Усяго ў спаборніцтвах удзельнічала 229 каманд вядучых ВНУ 12 краін (Расія, Беларусь, Латвія, Літва, Эстонія, Арменія, Азербайджан, Грузія, Казахстан, Узбекістан, Таджыкістан, Туркменістан), якія заваявалі гэта права ў папярэдніх этапах спаборніцтваў.

Абсалютнымі пераможцамі спаборніцтваў стала каманда студэнтаў Санкт-Пецярбургскага нацыянальнага даследчага ўніверсітэта інфармацыйных тэхналогій, механікі і оптыкі, у якой выступілі шырока вядомы па школьных спаборніцтвах беларускі праграміст Генадзь Караткевіч і два студэнты ўніверсітэта, якія з'яўляюцца дзейнымі чэмпіёнамі свету 2012 г. Яны змаглі вырашыць 11 з 12 прапанаваных задач. Каманды Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта і Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага ўніверсітэта вырашылі па 10 задач і таксама атрымалі дыпломы 1 ступені. Поўную табліцу вынікаў можна ўбачыць на афіцыйнай старонцы спаборніцтваў (*http://neerc.ifmo.ru/information/standings.html*).

У спаборніцтвах ад Беларусі прымалі ўдзел 4 каманды БДУ, 2 каманды БДУІР, каманды Гродзенскага дзяржуніверсітэта, Брэсцкага тэхнічнага дзяржуніверсітэта і Полацкага дзяржуніверсітэта. Каманды БДУ ў чарговы раз пацвердзілі сусветны ўзровень падрыхтоўкі, паказаўшы высокія вынікі. Першая каманда БДУ, у склад якой уваходзяць пяцікурснікі факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі Раман Удавічэнка, Андрэй Малевіч і Сяргей Жгіроўскі, заваявала права ўдзелу ў фінале чэмпіянату свету ў чэрвені 2013 г., а астатнія каманды БДУ атрымалі два дыпломы 2-й ступені і адзін дыплом 3-й ступені. Каманды іншых ВНУ Беларусі таксама выступілі годна, але, на жаль, пуцёвак у фінал не заваявалі.

**Ілья ТРАФІМАЎ**

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

7 снежня 2012 года
Падпісана да друку 5.12.2012 г.
Зак. . Тыраж 1500 экз.
Надрукавана ў РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ»
ЛП № 02330/0494178 ад 03.04.2009.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

**Рэдактар Сяргей ШАФАЛОВІЧ**
Карэктар Ганна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 102, тэл. 259-70-77,
*e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by*